# Берасцейскі універсітэт

Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна

ВЫДАВЕЦ: установа адукацыі «БРЭСЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ А.С. ПУШКІНА»
**Выдаецца з 1997 года**

**№ 12 (132)**
Выходзіць 2 разы ў месяц
на беларускай і рускай мовах
17 сакавіка 2010 года

## Сёння ў нумары:

**✔ Спортімгненне**
З падборкай навін спорту вы можаце пазнаёміцца на
стар. 2

**✔ Неапошняе слова на дарогу**
Размеркаванне – момант, якога з нецярпеннем і хваляваннем чакаюць будучыя маладыя спецыялісты
стар. 3

**✔ Зберагчы сэрца**
Наша госця ў рубрыцы «Праз адлегласць гадоў» – Ала Яўгенаўна Ільіна, былы выкладчык кафедры матэматычнага аналізу і дыферэнцыйных ураўненняў
стар. 4

**✔ Тры дні мазгавой атакі**
Рэпартаж К. Марыневіч з «Зімовай школы студэнцкай журналістыкі–2010»
стар. 5

**✔ У яе ўсё атрымалася**
Інтэрв'ю са студэнткай факультэта замежных моў М. Ульоа Міньа, што заняла трэцяе месца на адным з прэстыжных конкурсаў, чытайце на
стар. 7

**✔ Легенда року ў горадзе над Бугам**
стар.8

# АДКРЫТАЯ СІСТЭМА

***3–4 сакавіка праходзіла абласная навукова-практычная канферэнцыя «Формы і метады ідэалагічнай працы па забеспячэнні выканання праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця Брэстчыны ў Год якасці».***

***На другі дзень канферэнцыі ў нашым універсітэце працавала секцыя «Пераемнасць формаў ідэалагічнай працы ў сучаснай установе прафесійнай адукацыі». Рэктар М.Э. Часноўскі пазнаёміў гасцей з асноўнымі накірункамі дзейнасці БрДУ імя А.С. Пушкіна, запэўніўшы, што «універсітэт – адкрытая сістэма».***

***Прарэктар па выхаваўчай і сацыяльнай працы Л.А. Гадуйка акцэнтавала ўвагу менавіта на сістэме ідэалагічнай і выхаваўчай працы універсітэта (тэма яе выступлення – «Мадэляванне і метадычнае суправаджэнне ідэалагічнай працы ва ўстановах, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі».***

***Кіраваў працай секцыі начальнік упраўлення адукацыі Брэсцкага аблвыканкама М.А. Ціханчук.***

На фота: рэктар М.Э. Часноўскі сустракае гасцей – удзельнікаў канферэнцыі



## ШТО Ў СВЕЦЕ?

# ИНФОРМАЦИОННАЯ МОЗАИКА

В соответствии с законом «О внесении изменений и дополнений в некоторые кодексы Республики Беларусь по вопросам уголовной и административной ответственности» с 23 февраля распитие пива и слабоалкогольных напитков в общественных местах запрещено. К слабоалкогольным относятся напитки с объёмной долей этилового спирта от 0,5% до 7%. Штрафные санкции установлены такие же, как и за распитие в общественных местах спиртных напитков. На первый раз предусмотрен штраф до 8 базовых величин (в настоящее время одна базовая величина составляет 35 тыс. рублей). При повторном правонарушении в течение года уже придётся заплатить от 2 до 15 базовых величин.

• • •

Зимняя Олимпиада в Ванкувере стала первой, на которой представитель белорусской сборной завоевал золотую медаль. «Золото» принёс Алексей Гришин, победив в акробатике (фристайл); «серебро» – биатлонист Сергей Новиков в индивидуальной гонке на 20 км, «бронзу» – 23-летняя биатлонистка Дарья Домрачёва в индивидуальной гонке на 15 км.

В медальном зачёте XXI зимних игр Беларусь заняла 17-е место. Для сравнения, в Турине–2006 Беларусь была на 21-м месте (0, 1, 0), в Солт-Лейк-Сити–2002 – на 23-м (0, 0, 1), а в Нагано–1998 – на 20-м (0, 0, 2).

## ФОТАФАКТ

***2 сакавіка ў канферэнц-зале універсітэта адбыўся семінар «Гандаль людзьмі: міфы і рэальнасць», арганізаваны кафедрай псіхалогіі развіцця і аддзелам выхаваўчай працы з моладдзю.***

***Для ўсебаковага разгляду названай у тэме семінару праблемы былі запрошаныя спецыялісты з розных устаноў і арганізацый г. Брэста. Так, з дзяржаўнай праграмай па супрацьдзеянні гандлю людзьмі і звязанымі з імі супрацьпраўнымі дзеяннямі студэнтаў пазнаёміла начальнік упраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі крымінальнай міліцыі УУС Брэсцкага аблвыканкама А.Ю. Царык і старшы оперупаўнаважаны таго ж упраўлення В.А. Сухарэвіч. З некаторымі аспектамі медыцынскай рэабілітацыі людзей, што трапілі ў рабства, аўдыторыю пазнаёміла галоўны ўрач гарадской гаспадарчаразліковай паліклінікі г. Брэста Л.М. Рудая, а пра псіхалагічную дапамогу такім людзям расказала псіхолаг абласнога кансультатыўнага цэнтру Беларускага Чырвонага Крыжа «Рукі дапамогі» І.І. Пісарава.***




# НАШЫ НАВІНЫ

***10 сакавіка прайшоў круглы стол «Роля жанчыны ў сучасным грамадстве» для студэнтаў факультэтаў псіхолага-педагагічнага, сацыяльна-педагагічнага, філалагічнага і замежных моў.***

***Арганізатар мерапрыемства – кафедра нямецкай мовы з методыкай выкладання.***

# СПОРТ-ІМГНЕННЕ

***24–26 лютага ў сталіцы адбываліся спаборніцтвы па таэквандо ў праграме Рэспубліканскай універсіяды . Зборная універсітэта на 8-м месцы, аднак ёсць пераможцы і прызёры ў індывідуальным заліку: С. Дзіканёў (І месца, факультэт фізічнага выхавання), А. Крывош (ІІ месца, факультэт фізічнага выхавання) і М. Голуб (ІІІ месца, матэматычны факультэт).***

• • •

***21–22 лютага ў Гродна праходзіў турнір па міні-футболе, прысвечаны 70-годдзю ГрДУ імя Я. Купалы. Каманда нашага універсітэта па выніках турніру стала 6-й.***

• • •

***З 18 па 23 лютага ў Магілёве праходзілі спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы ў праграме Рэспубліканскай універсіяды. Зборная нашага універсітэта заняла 7-е месца.***

***Лепшых вынікаў дамаглася каманда цяжкаатлетаў, што выступала на універсіядзе з 16 па 18 лютага ў Мінску. У асабістым заліку поспехаў дабіліся Ю. Радзівон (І месца), Д. Буніч (ІІ месца) (абодва – студэнты факультэта фізвыхавання) і В. Вярэніч (ІІ месца, матэматычны факультэт). У агульнакамандным заліку наша каманда 4-ая.***

• • •

***На Рэспубліканскіх спаборніцтвах па тэхніцы лыжнага турызму (г. Віцебск) каманда турысцкага клубу «Бярэсце» нашага універсітэта заняла 3-е месца.***

## ПРАФСАЮЗНАЕ ЖЫЦЦЁ

*Первичная профсоюзная организация студентов БрГУ имени А.С. Пушкина profstud.brsu.brest.by*

# НЕПОСЛЕДНЕЕ НАПУТСТВИЕ

**Распределение – момент, которого с нетерпением ждут будущие молодые специалисты. Студенты-выпускники, словно любопытные первокурсники, имеют кучу вопросов, чёткие ответы на которые хотят услышать из уст квалифицированных специалистов.**

4 марта на все вопросы студентов отвечали: заместитель председателя областного комитета работников образования и науки А.А. Драпей; заведующая отделом социально-правовой защиты обкома профсоюза работников образования и науки О.В. Харитонович; председатель профкома студентов нашего университета И.А. Жак и юрисконсульт отдела правовой и коммерческой работы БрГУ имени А.С. Пушкина М.В. Ильючик.

«Оставаться членом профсоюза нужно!» – чётко дала понять в своём выступлении А.А. Драпей: круг преимуществ от этого по месту работы только расширяется. Это – гарантия выплаты надбавок к окладу, решение вопросов охраны труда, пользование социальным фондом профсоюза, различные поощрения, а также бесплатная юридическая помощь. Первичная профсоюзная организация по месту работы имеет право представлять ваши интересы в суде.

Если вы не смогли прийти на встречу и у вас возникли вопросы по распределению и трудоустройству, задавайте, позвонив по телефонам 23-28-52 (Марина Владимировна Ильючик), 23-01-71 (Инна Алексеевна Жак).

*М. Буховецкая (юридический факультет)*



*Студентов интересовало многое*

## ДЫЯЛОГ

# говоря о кодексе

**Университетские годы – время вложения студентов в себя, своё будущее, в будущее своей страны.**

Эти слова депутата Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь А.Т. Онищук (на фото) определяют главную мысль её встречи со студентами 1–2-х курсов биологического и географического факультетов, а также со студентами-практикантами 4-го курса факультета иностранных языков.



Идея встречи родилась на кафедре педагогики в связи с подготовкой в Министерстве образования Кодекса об образовании Республики Беларусь. Традиционно курс педагогики начинается с изучения национальной системы образования – её структуры, состояния, тенденций и перспектив развития. Определённое место отводится ознакомлению с нормативными государственными документами, что и побудило нас обратиться к проекту Кодекса об образовании.

Соединить теорию педагогики с практикой законотворческой деятельности, предоставить возможность студентам вступить в диалог с представителем законодательной власти страны, ощутить себя соучастниками процесса созидания будущего нашего образования – вот задачи, которые ставили перед собой организаторы встречи.

Творческий учитель истории, мастер педагогического общения, замечательный руководитель (основатель и директор ГУО «Гимназия № 6 г. Бреста имени Маршала Советского Союза Г.К. Жукова»), Анна Тарасовна с первых слов установила в аудитории доверительную атмосферу. Её выступление называлось «Современное состояние системы образования в Республике Беларусь и перспективы её развития».

Говоря о Кодексе, А.Т. Онищук обратила внимание, что такой всеобъемлющий документ в области образовательных отношений, в котором нашла отражение идея непрерывного образования жителей республики от 2 месяцев и до завершения работоспособного возраста, в нашей республике разрабатывается впервые.

Обращаясь к присутствующим, Анна Тарасовна отметила, что студенческие годы являются самым благодатным периодом для самоактуализации, и призвала студенческую молодёжь не потерять это время.

В завершение А.Т. Онищук ответила на вопросы студентов и высказала пожелание о повторении подобных встреч.

*О.А. Иванова (доцент кафедры педагогики)*

## ПРАЗ АДЛЕГЛАСЦЬ ГАДОЎ



# ЗБЕРАГЧЫ СЭРЦА

**Наш сённяшні госць у рубрыцы «Праз адлегласць гадоў» – Ала Яўгенаўна Ільіна, былы выкладчык кафедры матэматычнага аналізу і дыферэнцыйных ураўненняў. У гады Вялікай Айчыннай Ала Яўгенаўна стала вязнем аднаго з фашысцкіх канцлагераў.**

Час адступае ўжо сёмы дзесятак, аддаляючы нас ад крывавай эпохі. На месцы разбураных гарадоў адбудаваліся новыя, вёскі адрадзіліся, землі пераараны мірнымі плугамі, а не выбухамі бомб, воды рэк ачысціліся ад крывавага прымесу…

Усё размерана і спакойна… І толькі тыя, хто жыў у гады вайны, да болю ўзіраюцца ў мірную сінь нябёсаў, нібы наглядзецца на яе не могуць. Прагна ўслухоўваюцца ў шчэбет птушак, нібы чуюць яго ўпершыню. Раны, зробленыя вайной, ужо зацягнуліся, але і да гэтага часу не даюць спаць – ныюць і баляць…

Я ішла па шумнай брэсцкай вуліцы, навокал спяшаліся людзі – ва ўсіх свае праблемы, перажыванні, сустрэчы…

Сустрэча запланавана і ў мяне… У адной з кватэр гэтага мітуслівага горада мяне чакала жанчына. Жанчына, што перажыла ўвесь жах вайны і атрымала як узнагароду ўспаміны, пра якія не хочацца гаварыць. Я разумела, што іду варушыць мінулае. Але разумела і тое, што гэтыя ўспаміны як паветра неабходныя нам, маладым. Мы падышлі ўжо да той мяжы, калі кожны ветэран – легенда, і за дзвярыма гэтай кватэры мяне чакала сустрэча з легендай, з мінулым, з вайной…

– ***Добры дзень!*** – захожу ў кватэру.

– *Праходзьце!* – запрасіла добразычлівая жанчына. – *Я памятаю, вы тэлефанавалі, гаварылі, што вас цікавіць вайна, але я не была ўдзельніцай непасрэдных ваенных дзеянняў, я – вязень аднаго з фашысцкіх лагераў. Можа, вас гэта не зацікавіць?*

***– Наадварот, нас цікавіць усё, што звязана з вайной. Але давайце пачнем з пачатку: раскажыце, дзе Вы нарадзіліся?***

*– Я нарадзілася ў Данбасе, на станцыі Папасная Луганскай вобласці. Там ёсць невялічкі горад Залатое – мы жылі на яго ўскрайку, насупраць школы. Мае бацькі былі настаўнікамі, я да вайны паспела закончыць сем класаў.*

*А потым у адну восень да нас дакацілася вайна. Немцы прыйшлі неяк нечакана, ніхто і не думаў, што яны сюды дойдуць. Прабылі ў нас недзе месяц-паўтара, але прынеслі нямала ліха. Занялі школу, зрабілі яе агнявой кропкай, наставілі там артылерыйскай тэхнікі.*

Ала Яўгенаўна замаўчала. Я бачыла, як змяніўся выраз яе твару. Менавіта ў гэты момант пакой напоўніўся вайной. Вайна прыйшла, яна стаяла побач з жанчынай і пракручвала сюжэты свайго жудаснага, хоць і былога, існавання…

Я загаварыла першай:

***– Раскажыце, калі ласка, пра людзей, якія ў гэты час былі разам з Вамі?***

*– Бацька да гэтага часу ўжо пайшоў на фронт, але потым мы даведаліся, што ён трапіў у палон. Мы з матуляй засталіся адны. Увесь час нам дапамагала цётка Надзя.*

*Суседзі ў нас былі: жанчына і двое яе сыноў – яны нам таксама дапамагалі. Адзін з сыноў, усяго на год за мяне старэйшы, прыбавіў сабе гадоў і ў армію пайшоў для таго, каб «пайку» мець і маці з братам хоць неяк пракарміць. Ён такі маленькі, худзенькі быў, санітарам служыў. Як зараз памятаю, як плакаў гэты санітар, калі не змог выцягнуць з поля бою здаровага мужчыну-афіцэра. І так пакутаваў, амаль да адчаю сябе давёў, столькі віны за сабой адчуваў. Ён 25 красавіка загінуў, пад Берлінам…*

Яна яшчэ хацела нешта дабавіць, але не дагаварыла, не вытрымала наплыву эмоцый… Па шчацэ пакацілася адзіная слязінка, і тая была хуценька падхоплена жанчынай у хусцінку …

*– У гэты час (быў ужо сорак другі год) зноў адкрылі школу, і я пайшла ў восьмы клас. А потым вярнуўся бацька, і мы пешшу пайшлі за 400 кіламетраў на яго радзіму, думалі, там будзе працей і лягчэй…*

Ала Яўгенаўна ўздыхнула, даючы зразумець, што ні працей, ні лягчэй на радзіме бацькі не стала.

*– Аднак і там мы нядоўга прабылі: у адзін дзень паведамілі пра неадкладную эвакуацыю горада.*

*(Працяг на старонцы 6)*

## ПАРАДА ПСІХОЛАГА

***«Что-то жизнь стала скучной. Не хватает чего-то в ней. Мне говорят, что проблема только во мне. Так ли это?»***

Действительно ли «…чего-то не хватает?». А может у Вас период «затишья», и организм нуждается в дополнительном отдыхе или накапливает силы перед предстоящим «рывком»?

Да, правы те, кто утверждает, что многое из происходящего зависит только от нас. И Вы сами можете привнести в свою жизнь побольше ярких красок и звучных ноток. Иногда достаточно лишь небольшого усилия с Вашей стороны (встреча с друзьями, тёплый разговор с родными, дополнительные пять минут сна или активных движений и т.п.) – и краски жизни вернутся. Не упускайте возможностей, сделайте что-нибудь «вопреки», чтобы вернулось «в охотку».

***Е.А. Корзун***
***(педагог-психолог ПС)***

## ЗНАЕТЕ ЛИ ВЫ...

♦ кошки издают более 100 звуков. Собаки – около 10?

♦ киты не могут дышать под водой?

♦ есть два млекопитающих, которые откладывают яйца: утконос и ехидна? Оба обитают в Австралии.

♦ коровы выделяют за день 15 вёдер слюны?

♦ еноты моют любую пищу перед едой?

♦ паук-крестовик каждое утро съедает свою сеть, а потом плетёт её заново?

♦ у всех зебр полосы имеют неповторимый рисунок, по которому они узнают друг друга?

♦ из всех животных у колибри самое крупное сердце по отношению к размеру тела. В спокойном состоянии оно совершает 1000 ударов в минуту.

***Е. Басалай***
***(биологический факультет)***

## З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# ТРИ ДНЯ МОЗГОВОЙ АТАКИ

**Многие любят прихвастнуть: мол, знаком с тем-то, воочию видел того-то. Сегодня и мне предоставляется такая возможность, и всё благодаря «Зимней школе студенческой журналистики», прошедшей 19–21 февраля на базе спортивно-оздоровительного комплекса БГУ «Бригантина».**



*«Ведущий новостей Е. Лашковский обещал моргнуть нам в прямом эфире...»*

Школа оказалась одним из самых насыщенных событиями, новыми знакомствами и информацией мероприятием, в котором я когда-либо участвовала. Она собрала около двухсот пятидесяти редакторов, корреспондентов, дизайнеров студенческих газет со всей страны. Семинары вели лучшие преподаватели института журналистики Белгосуниверситета.

Для самых активных занятия могли начинаться в девять утра и заканчиваться в час (!!!) ночи. При этом каждая из восьми команд за два дня должна была создать и выпустить газету на четырёх полосах, да и не забыть её успешно пропиарить (как же иначе набрать побольше голосов подписчиков?). Немудрено, что для многих самым «жарким» временем была именно ночь, когда готовились – а нередко и реализовались – проекты.

Одной из непростых задач для участников соревнующихся команд оказалось сплочение: команды были составлены так, чтобы в них не было двух представителей из одного учебного заведения. Мне не повезло: нашей команде ни сплотиться, ни даже познакомиться друг с другом не удалось (по оценке организаторов, это беспрецедентный случай в истории «Зимней школы»). Несколько активистов решили назвать газету, которой так и не суждено было выйти, «Забей». Наша креативность не осталась незамеченной: газета награждена в номинации «За верность выбранной концепции». Радости команды не было предела. ☺

Каждый мог поучаствовать, кроме семинаров, и в настоящей, по всем законам жанра, пресс-конференции с министром образования А.М. Радьковым и ректором БГУ С.В. Абламейко. Желающих задать провокационный вопрос и тому, и другому было столько, что пришлось несколько отложить обед, но все вопросы так и не были заданы.

Настоящий фурор вызвали мастер-классы с участием маститых журналистов. Мне посчастливилось попасть на встречу с главным редактором журнала «Беларуская думка» В. Гигиным и ведущим новостей на телеканале ОНТ Е. Лашковским. Первый покорил тем, что вдохновенно рассказал о своей дочке, у которой режется шестой зубик, а последний пообещал моргнуть нам во время прямого эфира, и, кстати, не забыл об обещании.

С «Бригантины» мы уезжали со смешанными чувствами, но с новыми друзьями и богатым опытом. А что может быть важнее?

*К. Мариневич*
*(факультет иностранных языков)*

## КАМЕНТАР УДЗЕЛЬНІКА

*Прачытала артыкул Кaці, ды захацелася ўставіць і свае «пяць капеек». Пашырыць, так бы мовіць, агульную карціну.*

*Мы былі з Кацяй у розных групах, і часта па-рознаму бачылі адны і тыя ж рэчы. Каб чытач не падумаў, што гартаванне карпаратыўнага духу было самым цяжкім выпрабаваннем для ўдзельнікаў «Школы», скажу, што так было далёка не ва ўсіх камандах. Усеагульнае здзіўленне, напрыклад, выклікала група, прадстаўнік якой амаль адразу пасля аглашэння творчага задання (калі ўсе яшчэ не паспелі адзін з другім пераznaёміцца, нават нягледзячы на намаганні псіхалагічнай службы) выбег на сцэну, пазычыў мікрафон у вядучых і на ўсю залу агучыў назву будучага выдання. Гэта праз гадзіны дзве пасля нашага прыезду ў «Брыганціну». Вось тады і стала зразумела: барацьба за чытацкую аўдыторыю толькі пачынаецца і лёгкай яна не будзе. Усё, як у «дарослай» журналістыцы.*

*Раскручванне газет наогул пакінула добрыя ўражанні. Чаго толькі не выдумлялі крэатыўныя піяршчыкі! Тут вам і спантанныя акцыі пасярод семінараў у чужых камандах (добра, што выкладчыкі досыць паблажліва ставіліся да зрыву заняткаў), і бліц-апытанні, і фірмовыя імправізаваныя бэйджы, і разнастайныя друкаваныя рэкламкі, і снежныя выявы газетных эмблем. Нечакана і вельмі смешна выглядалі гардэробшчыцы, якіх студэнты падмовілі ненадоўга начапіць таблічкі з надпісам «Я выбіраю «ІМНО» (адна з газет-праектаў). Чым больш здзіўлення выклікала рэалізацыя пэўнага піяр-ходу, тым больш бонусаў атрымлівала каманда. Не без гонару скажу, што газета нашай групы «Эксперымент» стала пераможцай менавіта ў галіне праўядзення піяр-кампаніі.*

*Асобнае «дзякуй» выкладчыкам, якія, не шкадуючы, дзяліліся з намі не проста інфармацыяй, а вопытам. І гэта ацанілі ўсе ўдзельнікі «Зімовай школы студэнцкай журналістыкі–2010».*

*І. Хоміч*

## РЭФЛЕКСІЯ

**24 февраля на социально-педагогическом факультете прошёл традиционный конкурс «Мистер социально-педагогического факультета–2010».**

Участникам конкурса предстояло выдержать ряд испытаний: оригинально и лаконично представить себя членам жюри и зрителям; вместе с группой поддержки рассказать о будущей профессии; раскрыть художественные способности в конкурсе рисунка «Самое ценное в жизни мужчины»; продемонстрировать свой интеллектуальный уровень в викторине «Мой факультет»; показать поэтические умения в конкурсе «Золотое перо».

Зрители, а это в большинстве своём студентки факультета, проявили незаурядный интерес к конкурсу и оказали достойную поддержку всем его участникам.

Конкурсанты были награждены памятными подарками. Сертификат победителя в номинации «Мистер искренность» получил Д. Жакун (2-й курс), в номинации «Мистер оригинальность» – В. Мирский (1-й курс), в номинации «Мистер артистизм» – Е. Пилипчук (3-й курс). А почётное звание «Мистер социально-педагогического факультета–2010» и диплом победителя завоевал Д. Мельничук (3-й курс).

*Л.А. Скиндер*
*(замдекана по воспитательной работе социально-педагогического факультета)*

## POST FAKTUM

**26 февраля 2010 года. За окном светит солнце, ветер слегка колышет ветви деревьев – всё, кажется, идёт своим чередом, и день не предвещает ничего нового. Но это только на первый взгляд…**

В 14.40 началась поистине незабываемая межфакультетская презентация «Мой родны кут», организованная кафедрой иностранных языков. Ведущие и участники сего мероприятия выступали на белорусском и немецком языках.

Хочется отметить, что программа была очень насыщенной и разнообразной, как по содержанию, так и по подаче материала. Здесь – и песни, и танцы, и стихи собственного сочинения, и своеобразное путешествие по достопримечательностям Бреста. Всем по душе пришлась викторина, в которой по старым фотографиям необходимо было узнать современную улицу и здание на ней.

Не менее интересна и вторая викторина. На немецком языке давались названия предприятий, выпускаемая ими продукция и улица, где данное предприятие расположено. Необходимо было правильно соотнести слова. Всем участникам викторины вручили сладкие подарки от брестских производителей.

Благодарим организаторов мероприятия за творческий подход к делу, за море позитивных эмоций, а участников за активность, и желаем всем дальнейших творческих свершений и успехов во всех начинаниях.

*Т. Семкова (географический факультет)*

# Любопытство не порок?



**1 марта – Международный день борьбы с наркотиками. Волонтёрский отряд «Инсайт» социально-педагогического факультета не мог оставить без внимания эту дату.**

Волонтёры подготовили и провели акцию «Зеркало жизни», направленную на отказ от рискованного поведения. Студентам – участникам акции – предлагали заглянуть в красочную коробку с надписью «ОПАСНО!». Тех, кто отказался заглянуть в коробку, просили посмотреть в зеркало и увидеть себя такими же красивыми и здоровыми в будущем.

А студенты, отважившиеся посмотреть на содержимое коробки, находили в ней листочки различного цвета, которые символизировали столкновение с определёнными видами наркотиков. Тут же любопытные участники акции в импровизированном зеркале – шарже на человека, употребляющего наркотики, – видели и последствия их приёма. Волонтёры – консультанты по ЗОЖ – готовы были рассказать о вреде употребления наркотиков.

Вот так студенты на личном примере убедились в опасности рискованного поведения. Для более полного осознания проблемы и ответственного отношения к своему здоровью они получили красочные буклеты с информацией о разрушающем действии наркотических веществ.

*Ю. Шугай (социально-педагогический факультет)*

## ПРАЗ АДЛЕГЛАСЦЬ ГАДОЎ

(Пачатак на старонцы 4)

*Усіх, хто не паслухае, немцы пагражалі расстраляць. Мы пакінулі горад, але далёка адысці не паспелі: нас сустрэлі аўтаматчыкі і падзялілі на дзве калоны. Жанчын і дзяцей пакінулі ў горадзе, а мужчын і моладзь пагналі ў Германію. Потым я даведалася, што немцы выканалі абяцанне і ўсіх, хто не выйшаў за*

# ЗБЕРАГЧЫ СЭРЦА

*горад, знайшлі і расстралялі.*

***– Так пачынаецца Ваш шлях як палоннай? Куды Вас вялі?***

*– Нам не гаварылі куды. Гналі пешшу ў жудасных умовах, узяць з сабой нічога не дазволілі: ні вопраткі, ні ежы. Выратоўвала толькі тое, што, калі праходзілі праз якую-небудзь вёску, жанчыны з усіх канцоў беглі пакарміць нас, змучаных і галодных. Так разам з бацькам мы дайшлі да Венгры, а далей нашы дарогі разышліся: яго пагналі далей, а мяне адвезлі ў вялікі лагер пад Венай. У лагеры было невыносна: голад, холад, плач, стогны, галашэнне, пастаяннае адчуванне смерці…*

*Кармілі нас, як свіней, нейкай пахлёбкай, якая складалася з неабабранай бульбы, морквы, бручкі і ці то мукі, ці то вотруб'я, каб гусцейшай была. Уранак і вечарам давалі стакан вару, я нават не памятаю, ці быў хлеб. Пасля такога харчавання ўжо ў мірны час я моркву дзесяткі гадоў не ела, толькі ў апошні час стала ў супы яе дабаўляць. Накармілі ў лагеры на ўсё жыццё.*

***– Як Вы выйшлі з лагеру?***

*– Паколькі працаваць нас не прымушалі, я аднойчы выйшла ды чыгункі і ўбачыла эшалон, а каля яго чаргу. Я стала ў тую чаргу, перакананая, што горш, чым ёсць, усё роўна не будзе.*

*Мне паставілі на руку пячатку з літарай «К» і пасадзілі ў вагон. Так я апынулася ў Крэмсе, што ў Аўстрыі (вось што азначала літара «К» на руцэ). Адтуль трапіла на працу ў аўстрыйскую сям'ю, дзе і прабыла амаль цэлы год – з чэрвеня 1944 па май 1945 года.*

***– Як я зразумела, Перамога знайшла Вас у Аўстрыі. Шлях дадому быў цяжкім?***

*– Вайна ўвогуле не мае лёгкіх шляхоў. Хоць на той час яна ўжо закончылася, але нямала наслядзіла, наламала, заблытала, перакроіла…*

***– Ала Яўгенаўна, прабачце маю настойлівасць, але ўсё ж раскажыце, якія пачуцці пакінула ў Вашай памяці вайна.***

*– Ведаеце, тут столькі ўсяго змешана. З аднаго боку, з жахам успамінаю першыя дні вайны. Я не аднойчы пасля прачыналася ноччу ад кашмараў: мне сніліся самалёты, якія з гулам праносіліся над галавой і скідвалі бомбы… вакол паніка, крыкі, енкі… і я сярод усяго гэтага пекла, маленькая, бездапаможная дзяўчына, якая не ў стане змяніць свой лёс… Гэты жах праследуе мяне і зараз, і ў такія хвіліны я ўсім сэрцам ненавіджу і праклінаю фашызм і фашыстаў.*

*А з другога боку, успамінаю аднаго немца, які даў майму бацьку кальсоны і коўдру, пабачыўшы, што я напалову распранутая. Зараз я разумею, што, пашкадаваўшы мяне, савецкую дзяўчыну, ён падстаўляў, у першую чаргу, сябе. Я памятаю чырвоныя туфелькі, якія мне дала гаспадыня-венгерка, убачыўшы, што я босая…*

Я слухала жанчыну, мудрую, добрую, разважлівую. Жанчыну, якая вынесла з вайны самае галоўнае – сэрца… Чулае жаночае сэрца, здольнае любіць і даравать, спачуваць і захапляцца, радавацца простым дробязям чалавечага жыцця. Яна зберагла тое адзінае, што варта было берагчы…

Я ішла пасля сустрэчы з мінулым… Зараз я ведала: вайна злучыла намнога больш несумяшчальнага і процілеглага, чым здаецца на першы погляд.

*Г. Лось (юрыдычны факультэт)*

***Как узнать обо всех новостях университета и поучаствовать в его жизни? Welcome to www.brsu.brest.forum.by!!!***

***Обсуди интересующие тебя вопросы, создай собственную тему, делись мыслями и знакомься!***

***Здесь же узнай о новостях ректората, деканатов и подразделений университета.***

***В общем, если тебе интересно быть в курсе всего, ЗАХОДИ! www.brsu.brest.forum.by***

## ЯК ДОБРА ПРАВЕСЦІ ЧАС?

**Прапаную вам пусціцца са мною ў вандроўку па мерапрыемствах, якія адбудуцца ў Брэсце напрацягу другой паловы сакавіка. Перш за ўсё зробім агляд кінатэатраў.**

Што падрыхтаваў нам «1 Мая»? Калі вы плануеце прыйсці ў кінатэатр з мэтаю спакойна адпачыць, то вам лепш патрапіць на рамантычную камедыю «Каханне здараецца» і мульты «Барашак Шон» ці «Элвін і бурундукі-2». Знойдуцца і фільмы для аматараў жахаў – напрыклад, «Турнір на выжыванне».

Што чакае нас у кінатэатры «Беларусь»? Па-першае, варта наведаць 5D-атракцыён, хоць ролікаў там, на жаль, няшмат. Гэта добрая магчымасць пакатацца на амерыканскіх горках ці пабываць у космасе – і усё не зыходзячы з месца. У кінатэатры, акрамя таго, праходзіць шэраг прэм'ер: «Каханне ў вялікім горадзе-2», «Мы з будучага-2», а таксама мульт «Як прыручыць дракона?».

На якія мерапрыемствы запрашае ГДК?

27 сакавіка адбудзецца «Арт-праект–2010» з удзелам такіх гуртоў, як «Dalailama Band», «PRANA», «Vertigo Band», «Растение Мудрости» і інш. Там жа запланаваны вечар наватарскай літаратуры і галерэя-выстава нефарматных фотаздымкаў і малюнкаў.

Куды яшчэ варта патрапіць?

Нельга прапусціць канцэрт «Ляпіса Трубяцкога», які адбудзецца 19 сакавіка ў клубе Zio-Pepe. 27 сакавіка ДК Прафсаюзаў запрашае на акустычны канцэрт «Старога Ольсы», дзе адбудзецца прэзентацыя іх новага альбому «Дрыгула».

Прыемнага вам правядзення часу!

*А. Вольная*
*(факультэт замежных моў)*

## ДАСЯГНЕННІ

# ЕЙ ВСЁ УДАЛОСЬ

**Замечали ли вы когда-нибудь, как мало вы знаете о людях, которых-то и видите, вроде, каждый день? Вы всё знаете об их увлечениях, пристрастиях, талантах?**

Я убеждена, что у нас на факультете учатся особенные люди, – у вас, думаю, тоже. Но среди них есть и совершенно особенные. К их числу принадлежит и моя героиня – Мария Ульоа Миньо, занявшая 3-е место в одном из престижных конкурсов.

**– Маша, первый, предсказуемый вопрос: откуда такая фамилия?**

– У меня папа из Никарагуа. Это в Латинской Америке (так, на всякий случай).

**– Необычно, конечно. Расскажи о проекте, в котором ты участвовала.**

– Это был конкурс «Социальная реклама–2009», проводимый Национальной академией наук Беларуси.

**– А как ты узнала о конкурсе?**

– Объявление я нашла на факультете. Кроме того, преподаватель кафедры английского языка с методикой преподавания И.Л. Ильичёва, которая ведёт у нас спецкурс «Современные рекламные технологии», рекомендовала в нём поучаствовать.

**– И что ты в итоге сотворила?**

– Я придумала видеоролик о вреде курения. Мы послали заявку (участие принимали и другие ребята с факультета) и через некоторое время нас пригласили в Минск для защиты проектов.

**– Расскажи о ролике.**

– Идея появилась внезапно. Ролик снимался в казино, состоял из нескольких частей. К примеру, в первой части крутится рулетка, а потом появляются слова: «Никогда не знаешь, какой номер выпадет». А финальной была фраза: «Не играй со своим здоровьем». Организовать съёмку мне помог менеджер казино, а монтировать – знакомые ребята.

Ролик, кстати, по качеству получился не хуже, чем у участников, которые изучают режиссуру.

**– Здорово. Маша, а где можно будет увидеть твой ролик?**

– Планируется его использование в конференциях и даже показ по телевидению.

Что ж, Маше всё удалось, она, как настоящий политик,



даже умудрилась поговорить о возможном сотрудничестве Национальной академии со своим факультетом. Удачи Маше в новых проектах. Надеюсь, её пример подтолкнет вас к действию, когда вы увидите объявление об очередном конкурсе.

*К. Мариневич*
*(факультет иностранных языков)*

## САКАВІК У ГІСТОРЫІ

*18.03.1892 г. – заснаваны прыз для лепшай хакейнай каманды – Кубак Стэнлі.*

*19.03.1955 г. – У Масадзе (Ізраіль) выяўлены рэшткі палаца цара Ірада.*

*20.03.1921 г. – у пракат выпушчаны першы мульт-фільм, створаны пры ўдзеле Уолта Дыснея.*

*21.03.630 г. – Іраклій I вярнуў у Іерусалім вялікую хрысціянскую святыню – Жыватворны Крыж.*

*22.03.1634 г. – Рэмбрант ажаніўся з Саскіяй, якую маляваў на многіх палотнах.*

*22.03.1874 г. – упершыню праводзіцца гульня ў вялікі тэніс.*

*22.03.1907 г. – У Лондане з'явіліся першыя таксі з лічыльнікамі. Тады і нарадзілася сама назва гэтага віду гарадскога транспарту.*

*22.03.1943 г. – фашыстамі спалена Хатынь.*

*24.03.1896 г. – у Афінах адкрыліся першыя Алімпійскія гульні.*

*25.03.1918 г. – прадстаўнікі нацыянальных партый і рухаў Беларусі абвясцілі пра стварэнне Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР), незалежнай галоўным чынам ад Расіі.*

*27.03.1867 г. – Карл Маркс завяршыў працу над першым томам «Капіталу».*

*28.03.1776 г. – заснаваны Вялікі тэатр у Маскве.*

*29.03.168 да н.э. – гэтай датай пазначана першая ў свеце газета, што захавалася да нашых дзён (на дошцы. Рым).*

*29.03. 1886 г. – у ЗША пачала рэалізоўвацца «Кока-кола». Прадавалі яе як «мазгавы тонік», абяцаючы збавенне ад разумовага знясілення.*

*31.03.1967 г. – пасля выхаду Францыі з НАТА штаб-кватэра арганізацыі пераведзена ў сталіцу Бельгіі Брусэль.*

*31.03.1996 г. – Б. Ельцын падпісаў указ пра спыненне ваенных аперацый у Чачні.*

*В. Бялюк*
*(гістарычны факультэт)*

## УРАЖАННЕ

# ЛЕГЕНДА РОКА В ГОРОДЕ НАД БУГОМ

**3 марта в Бресте прошёл концерт Джо Линн Тёрнера. Его имя знают те, кто любит настоящий рок-н-ролл. Джо не только профессионально отработал программу в сопровождении инструментальной группы (кстати, аккомпанемент ему обеспечили музыканты из Минска), но и сумел создать тёплую домашнюю атмосферу на концерте.**

Музыкальную биографию Тёрнер начал в группе Fandango. Затем была работа с такими именитыми музыкантами, как Ричи Блэкмор, Ингви Мальмстин. Джо даже записал альбом с группой Deep Purple, куда его привёл всё тот же Ричи Блэкмор. Но группу пришлось покинуть из-за недовольных взглядов остальных участников, которые считали, что Тёрнер должен петь, подражая Ену Гиллану – предыдущему вокалисту Deep Purple.



Но вернёмся к брестскому концерту. Я, честно говоря, был сильно удивлён приездом звезды в наш городок. В прошлом году Тёрнер посетил Беларусь только с одним концертом в столичном городе, да и то вместе с бывшими участниками группы Rainbow, что обеспечило заполненность зрителем концертной площадки. В этом году он проедет с концертами всю страну.

Когда Тёрнер появился на сцене ДК Профсоюзов, зал взорвался аплодисментами. Спев одну песню, певец вдруг удивился: мол, чего это вы, ребята, сидите! Быстро вставайте и занимайте свободное пространство перед сценой! Эта фраза была произнесена, естественно, по-английски. Но народ всё понял, и часть публики ринулась к сцене. В основном это были молодые любители тяжелого рока, в числе которых оказался и я.

Маэстро вёл себя очень дружелюбно. Неоднократно во время концерта вплотную приближался к толпе, жал всем руки, шутил, разговаривал со зрителями, даже успел дать парочку автографов.

Репертуар концерта был предсказуемым. В основном, Тёрнер исполнял старые хиты: «I surrender», «Long live rock'-n'roll», «Kill the king», «All night long» и др. Но и одной его собственной песне нашлось место в плей-листе концертной программы, что также не могло не порадовать поклонников тяжелой музыки.

Минут через 20 после концерта, отдышавшись, Джо вышел в фойе для автограф-сессии. Все желающие получили заветную подпись, а одной девушке даже удалось сфотографироваться с маэстро. Правда, на мою просьбу о совместном фото я получил отказ, исходивший не от самого Тёрнера, а от «администратора-охранника», побоявшегося, по-видимому, что таких желающих найдётся немало, и тогда Тёрнер не уедет из ДК до утра.

В общем, впечатлений от прошедшего 3 марта концерта у всех, кто его посетил, без сомнения, осталось много. И главная заслуга в этом, конечно же, принадлежит самому певцу, который позволил своим фанам максимально приблизиться и к сцене, и к своему творчеству.

*И. Харевич*
*(филологический факультет)*

У мінулым нумары мы друкавалі рэпартаж з універсітэцкага конкурсу чытальнікаў «Таямніцы слова і думкі». Вершы, якія мы прапануем вашай увазе, былі адзначаны дыпломам другой ступені ў аўтарскім аддзяленні.

## ДРАНІКІ

*Дранікі – сіла. Кажуць, што дранікі –*
*Гэта культура нейкай керамікі.*
*Дранікі – гэта смачная акцыя,*
*Якую праводзіць бульбяная нацыя.*
*Дранікі, мабыць, крышку сімволіка:*
*Без рэферэндумаў, з сэнсам і логікай.*
*Дранікі – гэта нават палітыка,*
*На думку наватараў і аналітыкаў.*
*Ды й чаго вас вучу, калі дранікі*
*Кожны хоць раз смакаваў.*
*І збіраліся слінкі ў цэлае возера.*
*Дранікі – сіла, астатняе – дробязі.*

*Я. Карлюк*
*(студэнт БарДУ)*

## БАЛАНС

*Сей трюк я повторяю день за днём:*
*Сперва я подхожу к подъезду,*
*Роюсь в сумке (там всё вверх дном,*
*И что-то искать бесполезно).*
*«Ну где же ключи? –*
*вопрошаю в слезах, –*
*Ведь я закрывала квартиру!*
*Затем их в карман... нет,*
*наверно, не так...*
*Куда же я их положила?»*
*Но тут не по плану какой-то нахал*
*Решил попросить мой мобильный.*
*Зачем? Ах, зачем он об этом сказал,*
*Почти про баланс позабыла!*
*«Уйди! Проходи!*
*И не трогай меня!», –*
*Визгливо кричала на нервах.*
*А он удивлённо в ответ заморгал.*
*(Такого не видел, наверно.)*
*«Ты, может, это...*
*присядь, покури», –*
*Решил проявить он заботу.*
*«Да я не курю!*
*Замолчи!... замолчи...»*
*В кармане нащупалось что-то.*
*«О боги, нашла!» –*
*полетела в подъезд,*
*Попсу себе в нос напевая.*
*Но парень решил проявить интерес:*
*«Всегда ты чумная такая?»*
*Я, мордочку выставив в щёлку дверей,*
*Сказала: «Не трогай: я злая.*
*Вообще, что пристал?*
*Поищи поглупей!»*
*А он: «Что, глупее бывают?»*

*А. Альхименко*
*(филологический факультет)*

**«Берасцейскі універсітэт» № 12 (132)**

**Рэдакцыя:** рэдактар – І.А. Хоміч (тэл. 23–01–29).
Фота – Р.У. Хрыстафораў.
Карэктар – К.В. Каханчык.
Куратар – Л.А. Гадуйка.
Газета падрыхтавана на настольнай выдавецкай сістэме РВА БрДУ імя А.С. Пушкіна, 224665, г. Брэст, бульвар Касманаўтаў, 21.

Надрукавана на рызографе БрДУ імя А.С. Пушкіна.
224016, г. Брэст, вул. Міцкевіча, 28.
E-mail: gazeta_brsu@brsu.brest.by.
Падпісана ў друк 16.03.2010.
Аб'ём 1 ум. друк. арк. Тыраж 299 экз. Заказ № 107.
Рэдакцыя можа не падзяляць пункт погляду аўтараў артыкулаў.

***Газета запрашае да супрацоўніцтва студэнтаў, выкладчыкаў і спецыялістаў універсітэта***